РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 930(73+430)«1979/1990»

*І.І. Кавяка,*
*аспірант кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ*

## ГЕРМАНСКАЯ ПАЛІТЫКА ВЯЛІКАБРЫТАНІІ Ў 1979–1990 гг. (англа-амерыканская і нямецкая гістарыяграфія і крыніцы)

Германская палітыка Вялікабрытаніі ў 1979–1990 гг. у англа-амерыканскай і нямецкай гістарыяграфіі асвечана фрагментарна. Аўтарамі закрануты асобныя аспекты праблемы: эканамічныя адносіны Вялікабрытаніі з ФРГ і ГДР, ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва Вялікабрытаніі і ФРГ у рамках НАТА, агульныя кірункі і задачы знешняй палітыкі Вяліка-

брытаніі ў 1980-я гг. У 1979–1990 гг. брытанскі ўрад узначальвала лідар партыі кансерватараў, прэм'ер-міністр Маргарэт Тэтчэр. Таму некаторыя работы, прысвечаныя даследаванню тэтчэрызму, таксама змяшчаюць пэўную інфармацыю пра палітыку Вялікабрытаніі па германскім пытанні ў 1980-я гг.

Англамоўную крыніцазнаўчую базу даследавання склалі найперш дакументы і матэрыялы электроннага архіва М. Тэтчэр (www.margaretthatcher.org <http://www.margaretthatcher.org>), а таксама пратаколы пасяджэнняў палаты абшчын брытанскага Парламента. Архіў М. Тэтчэр утрымлівае звыш тысячы дакументаў брытанскага ўрада і Форын офіс (Міністэрства замежных спраў Вялікабрытаніі) па праблемах еўрапейскай і германскай палітыкі Брытаніі ў 1979–1990 гг. Акрамя таго, архіў змяшчае некалькі тысяч тэкстаў прамоў і выступленняў М. Тэтчэр падчас яе знаходжання на пасадзе прэм'ер-міністра. З дапамогай гэтых дакументаў можна прасачыць трансфармацыю знешнепалітычнай лініі М. Тэтчэр у 1980-я гг. Сярод выступленняў найбольшую каштоўнасць уяўляюць запісы гутарак брытанскага прэм'ер-міністра с канцлерамі ФРГ Г. Шмітам (1979–1982 гг.) і Г. Колем (1982–1990 гг.), стэнаграфічныя матэрыялы прэс-канферэнцый па выніках двухбаковых сустрэч, перапіс глаў урадаў і г. д. Архіў утрымлівае справаздачы брытанскага пасольства ва Усходнім Берліне за 1979–1990 гг., што дазваляе правесці даследаванне ўзаемаадносін Вялікабрытаніі і ГДР, параўнаць іх з англазаходнегерманскімі адносінамі і глыбей пранікнуць у сутнасць германскай палітыкі Вялікабрытаніі ў 1980-я гг. Самым інфарматыўным і дакументальна насычаным з'яўляецца раздзел архіва, які ахоплівае перыяд з восені 1989 па восень 1990 г. З часу адкрыцця Берлінскай сцяны (ноч з 9 на 10 лістапада 1989 г.) германскае пытанне стала найбольш актуальным для сусветнай грамадскасці. Праблема германскага ўрэгулявання абмяркоўвалася на сустрэчах паміж старшынямі ўрадаў, міністэрстваў, перамовамі па формуле «2+4», на канферэнцыях міжнародных арганізацый. Многія з дакументаў па германскім пытанні, якія характарызуюць пазіцыю Вялікабрытаніі, знаходзяцца толькі ў архіве М. Тэтчэр і раней нідзе не публікаваліся.

Пратаколы пасяджэнняў палаты абшчын англійскага Парламента за 1979–1990 гг. дапамагаюць прасачыць, якое месца займала праблема германскага ўрэгулявання ў палітыцы Вялікабрытаніі ў 1980-я гг. Да падзей восені 1989 г. асноўная ўвага дэпутатамі Парламента надавалася пытанням эканамічнага характару ў адносінах Вялікабрытаніі з ФРГ і ГДР, знешнегандлёвым аперацыям, асобным аспектам ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва Англіі і Заходняй Германіі ў рамках НАТА. З восені 1989 г. праблема германскага ўрэгулявання часта становіцца прадметам абмеркавання ў палаце абшчын. Дэпутаты падымаюць пытанні эканамічных наступстваў аб'яднання Германіі, урэгулявання дзяржаўных меж у Еўропе, будучага ваенна-палітычнага статусу аб'яднанай Германіі і г. д.

Да нямецкамоўных крыніц па тэме даследавання варта аднесці, у першую чаргу, звыш 430 апублікаваных дакументаў па германскай праблеме за 1989–1990 гг. Яны былі выдадзены Міністэрствам унутраных спраў ФРГ пры ўдзеле Федэральнага архіва ФРГ у 1998 г. [16]. Дакументальныя матэрыялы ахопліваюць перыяд з мая 1989 па кастрычнік 1990 г. і прызначаны для дэтальнага вывучэння эвалюцыі, шляхоў і метадаў вырашэння германскага пытання на міжнароднай арэне. Праблемы ўзаемаадносін паміж Бонам і Усходнім Берлінам у 1979–1982 гг. могуць быць даследаваны з дапамогай зборніка дакументаў «Бон і Усходні Берлін. 1969–1982 гг. Дыялог на вышэйшым узроўні і праз каналы даверу» [44]. Складальнік зборніка Г. Потхаф выкарыстоўваў матэрыялы Архіва грамадскай гісторыі ФРГ. Асноўную частку працы склалі запісы прамых і тэлефонных гутарак дзяржаўных лідараў, дыпламатычны перапіс пасольстваў.

Асаблівае месца ў англа-амерыканскай і нямецкай гістарыяграфіі займаюць мемуарныя выданні. Праца М. Тэтчэр «Гады на Даўнінг-стрыт» [51] і работа геапалітычнага характару «Мастацтва кіраваць дзяржавай» [52] дапамагаюць глыбей зразумець знешнепалітычныя арыенціры М. Тэтчэр, пранікнуць у сутнасць яе ўспрыняцця Германіі і германскага пытання. «Мастацтва кіраваць дзяржавай» уяўляе аналітычны разбор сусветнага парадку пасля аб'яднання Германіі і краху сацыялістычных рэжымаў у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і ўтрымлівае некаторыя прагнозы на будучыню для Еўропы, ЗША і ўсяго свету. Працы «Успаміны 1982–1990 гг.» [36] і «Нямецкае адзінства: прамовы і гутаркі» [35] былога канцлера ФРГ Г. Коля даюць багатую інфармацыю аб асноўных кірунках германскай палітыкі яго ўрада, аб становішчы ФРГ на міжнароднай арэне ў 1980-я гг., аб узаемаадносінах Заходняй Германіі з краінамі Еўропы і свету, уключаючы Вялікабрытанію. Мемуарны характар маюць і работы Г.-Д. Геншэра «Успаміны» [27], «Шанц немцаў» [25], «Нямецкая знешняя палітыка. Выбраныя прамовы і сачыненні» [26], Э. Крэнца «Турэмныя нататкі» [37], Х. Модрава «Я хацеў жыць у новайГерманіі» (перакладзена на рускую мову), Х. Тэльчыка «329 дзён: погляд на нямецкае адзінства знутры», В. Момпера «Падзенне мяжы. Берлін у гарачай кропцы нямецкай гісторыі» [38], К. Дуйсберга «Нямецкі год» [17]. Мемуары, як правіла, даюць гісторыку шмат малавядовых і цікавых фактаў, яны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

змяшчаюць дэтальнае апісанне падзей. Аднак асноўным іх недахопам з'яўляецца даволі высокая ступень суб'ектыўнасці ў выкладанні матэрыялу, зацікаўленасць аўтара ў асвятленні падзей мінулага ў пэўным святле.

Англа-амерыканскую гістарыяграфію германскай палітыкі Вялікабрытаніі ў 1979–1990 гг. можна ўмоўна падзяліць на дзве часткі. Першую группу складаюць працы, якія датычаць знешняй палітыкі Вялікабрытаніі падчас кіравання М. Тэтчэр. Да другой варта аднесці гістарычныя даследаванні, якія сканцэнтраваны на вывучэнні асобных аспектаў англа-заходнегерманскіх адносін у 1979–1990 гг.

Работа «Знешняя палітыка Вялікабрытаніі пры Тэтчэр» пад рэдакцыяй П. Бірда [8] прысвечана аналізу асноўных кірункаў і тэндэнцый развіцця брытанскай знешняй палітыкі ў 1980-я гг. Пэўную ўвагу аўтары звярнулі і на англа-заходнегерманскія адносіны. Выданні «Тэтчэрызм: асоба і палітычны курс» пад рэдакцыяй К. Міноўг і П. Бідыса [49] і «Тэтчэрызм: маштаб і межы» М. Холмса [23] уяўляюць даследаванні знешнепалітычнай складовай ідэалогіі тэтчэрызму. Аўтары разглядаюць асноўныя прынцыпы знешняй палітыкі Вялікабрытаніі, прыярытэты і нацыянальныя інтарэсы краіны на міжнароднай арэне ў эпоху М. Тэтчэр. Агульныя рысы германскай палітыкі М. Тэтчэр у 1989–1990 гг. адлюстраваны ў працы Э. Эванса «Тэтчэр і тэтчэрызм» [18]. Шырока выкарыстоўваючы матэрыялы прэсы і мемуарную літаратуру, аўтар робіць акцэнт на асабістым успрыняцці М. Тэтчэр ідэі германскага адзінства, а таксама аналізуе ўплыў фактару асабістых адносін М. Тэтчэр – Г. Коль на палітыку Вялікабрытаніі па германскім пытанні ў 1989–1990 гг. Асобныя аспекты германскай палітыкі М. Тэтчэр разгледжаны скрозь прызму падзей халоднай вайны ў 3-м томе (выйшла ў 3-х тамах) калектыўнай работы «Кембрыджская гісторыя халоднай вайны» [53]. Знешнепалітычны курс М. Тэтчэр знайшоў адлюстраванне ў працы біяграфічнага характару Х. Янга «Адна з нас. Біяграфія М. Тэтчэр» [57]. Зыходзячы з аналізу сустрэч М. Тэтчэр з канцлерамі ФРГ Г. Шмітам і Г. Колем у рамках развіцця двухбаковых адносін і ў маштабах еўрапейскай палітыкі, Х. Янг дае кароткую характарыстыку англа-нямецкім адносінам у 1980-я гг. Знешняя палітыка Вялікабрытаніі ў 1980-я гг. у сціслым выглядзе прадстаўлена ў выданні «Брытанская знешняя палітыка: традыцыі, змены і трансфармацыі» пад рэдакцыяй М. Сміта [7]. Вывучэнне прац па знешняй палітыцы Вялікабрытаніі ў перыяд кіравання М. Тэтчэр неабходна для комплекснага даследавання ўказанай праблемы, паколькі яно садзейнічае фарміраванню ў гісторыка цэласнага ўяўлення пра палітыку Вялікабрытаніі па германскім пытанні.

Другая група гістарычных прац прысвечана вывучэнню асобных аспектаў англа-заходнегерманскіх адносін у 1980-я гг. Некаторыя кірункі ўзаемадзеяння дзвюх дзяржаў былі часткова разгледжаны ў рабоце А. Нікалса «Заўсёды добрыя суседзі – ніколі добрыя сябры? Англа-германскія адносіны ў 1949–2001 гг.» [39]. Што датычыць 1979–1990 гг., то аўтар сканцэнтраваў увагу на аналізе адносін Вялікабрытаніі і ФРГ у рамках ЕЭС. А Нікалс даў характарыстыку эканамічным фактарам, якія збліжалі англійскую і заходнегерманскую еўрапейскую палітыку, прааналізаваў тыя цяжкасці і праблемы, якія азмрочвалі двухбаковыя адносіны ў 1980-я гг. Эканамічны бок англа-заходнегерманскага ўзаемадзеяння часткова адлюстраваны ў працы Д. Джонсана «Развітанне з востравам? Вялікабрытанія на парозе змен» [31]. У сваёй рабоце «Нямецка-англійскія адносіны: безнадзейны выпадак?» [40] даследчык А. Нікалс сканцэнтраваўся на разглядзе пазіцыі М. Тэтчэр па германскім пытанні ў 1990 г., а таксама сабраў інфармацыю аб стане брытанскай грамадскай думкі адразу пасля аб'яднання Германіі.

Агульная ацэнка брытана-германскіх адносін у першай палове 1980-х гг. дадзена ў працы «Партнёры і саапернікі ў Заходняй Еўропе: Англія, Францыя і Германія», выдадзенай пад рэдакцыяй Р. Моргана і К. Брэя [41]. Аўтары даследуюць некаторыя бакі еўрапейскай палітыкі трох дзяржаў, адзначаючы агульнае і адрознае ў нацыянальных інтарэсах англічан і немцаў у Еўропе. Дадзеная кніга ўтрымлівае вынікі сацыяльных апытанняў у Вялікабрытаніі, якія датычацца ўспрыняцця брытанцамі немцаў як нацыі і ФРГ як еўрапейскай дзяржавы. Р. Морган і К. Брэй уключылі ў калектыўную працу каштоўную інфармацыю наконт супрацоўніцтва партый і грамадскіх арганізацый дзвюх дзяржаў у дадзены перыяд.

Вывучэнню знешняй палітыкі Вялікабрытаніі і ФРГ у 1980-я гг. прысвечаны работы В. Ханрыдэра «Знешняя палітыка ФРГ, Францыі і Вялікабрытаніі» [21] і «Германія, Амерыка, Еўропа: 40 год нямецкай знешняй палітыкі» [20]. Аўтар надае асаблівую ўвагу разгляду адносін паміж ГДР і ФРГ у другой палове 1970–1980-я гг., а таксама узаемаадносінам дзвюх нямецкіх дзяржаў з Вялікабрытаніяй, Францыяй і ЗША. Пэўныя кірункі ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва Англіі і Заходняй Германіі ў рамках НАТА разгледжаны ў калектыўнай працы «Вялікабрытанія і Германія ў XX стагоддзі», выдадзенай пад рэдакцыяй М. Гёртэмакера [6]. Уплыў германскага фактару на пытанні бяспекі ў Еўропе прааналізаваны ў выданні «Дзве нямецкія дзяржавы і еўрапейская бяспека» пад рэдакцыяй Ф. Ларабі [54]. Аўтары робяць акцэнт на фактах актуалізацыі германскага пытання ў ФРГ у 1980-я гг., даюць ацэнку сітуацыі ў ГДР. Асобныя

РЭПАЗІТОРЫЙ ВДПУ

паложэнні брытанскага погляду на адзіную Германію на еўрапейскім кантыненце выкладзены ў рабоце «Германія і Еўропа ў руху» пад рэдакцыяй А. Ротфельда і В. Шутцэ [28]. Аўтарамі разгледжаны пытанні бяспекі і неабходнасці захавання ваеннага кантролю НАТА над Еўропай. Месца Германіі ў еўрапейскай палітыцы Вялікабрытаніі прааналізавана ў працы Т. Гартан Эша «У імя Еўропы: Германія і падзелены кантынент» [24]. Аўтар звязвае падзел Германіі з раздзелам Еўропы і бачыць шлях да еўрапейскага адзінства праз аб'яднанне Германіі.

Работы нямецкіх аўтараў таксама можна ўмоўна падзяліць на некалькі груп. Да першай мы аднясём працы агульнага характару, прысвечаныя гісторыі германскага пытання з часу ўзнікнення пасля Другой сусветнай вайны і да моманту яго вырашэння ў 1990 г. Паколькі работ такога кшталту вялікае мноства, мы спынімся толькі на тых, якія закранаюць палітыку Вялікабрытаніі па германскім пытанні ў 1979–1990 гг. Да ліку такіх выданняў адносяцца «Германія – адзіная Радзіма» А. Родэра [46], «Гісторыя немцаў 1949–1990» пад рэдакцыяй Э. Фура [29], «Сцяна. Гісторыя аднаго падзелу» Э. Вольфрума [56], «Германскае пытанне як стратэгічны ключ» пад рэдакцыяй Г. Кіфера [13], «Аспекты германскага пытання» пад рэдакцыяй П. Вайлемана [2], «Нямецкая гісторыя з 1945 г. па сучаснасць» Г. Пётча [43].

Да другой групы адносяцца работы, прысвечаныя разгляду агульных інтарэсаў Вялікабрытаніі і ФРГ у Еўропе ў 1980-я гг.: «Вялікабрытанія і Германія. Суседзі ў Еўропе» [30], «Германія, Вялікабрытанія, Еўропа: палітычныя традыцыі, партнёрства і саперніцтва» пад рэдакцыяй К. Рёэ [12], «Брытана-германскае абароннае супрацоўніцтва: партнёрства ўнутры альянсу» К. Кайзера і Дж. Ропера (перакладзена на рускую мову) [33]. Аналіз эканамічнага, палітычнага, ваенна-тэхнічнага ўзаемадзеяння дзвюх дзяржаў дапамагае выявіць глыбінныя прычыны германскай палітыкі Вялікабрытаніі ва ўказаны перыяд. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць біяграфічныя працы К. Пруйса [45] і В. Бікерыха [4], прысвечаныя асобе канцлера ФРГ Г. Коля. Аналіз жыцця і дзейнасці канцлера германскага адзінства змешчаны таксама ў калектыўным выданні «Нямецкія канцлеры ад Бісмарка да Коля» пад рэдакцыяй В. фон Штэрнбурга [14]. Працы біяграфічнага характару ўтрымліваюць інфармацыю аб асабістых узаемаадносінах дзяржаўных лідараў і старшынь урадаў, дапамагаюць прасачыць уплыў суб'ектыўных фактараў на ход падзей, вывучыць знешнепалітычную лінію кіраўніцтва.

Да наступнай групы мы аднеслі работы, якія адлюстроўваюць эвалюцыю германа-германскіх адносін у 1979–1989 гг. і пазіцыю Вялікабрытаніі па дадзеным пытанні. Тут варта вылучыць зборнік артыкулаў «Аспекты германскага пытання» пад рэдакцыяй К. Ланге [2], манаграфію Г. Кнопа «Германскае адзінства» [34], зборнік дакументаў «Гісторыя ГДР у дакументах» пад рэдакцыяй М. Юдта [10]. Да асобнай катэгорыі належаць выданні, якія ўтрымліваюць інфармацыю аб Вялікабрытаніі па германскай праблеме ў 1980-я гг. Такія даныя маюцца ў артыкуле Р. Дэйві «Вялікабрытанія і германскае пытанне» [9], манаграфіі В. Зайферта «Цэлая Германія. Перспектывы аб'яднання», А. Бірке «Вялікабрытанія і германскае адзінства» [5]. Аналіз германскай праблемы вядомага брытанскага аналітыка Т. Гартан Эша і журналіста «Таймс» М. Біньёна змешчаны ў калектыўным выданні «Рух у германскім пытанні? Непакой замежных краін наконт развіцця падзей у дзвюх нямецкіх дзяржавах» пад рэдакцыяй Э. Шульцэ і П. Данілава [3].

Самы буйны нямецкі гістарыяграфічны блок склалі працы, якія аналізуюць германскую палітыку Вялікабрытаніі ў 1989–1990 гг. Пазіцыя Вялікабрытаніі па германскім пытанні на перамовах «2+4» і прычыны занепакоенасці М. Тэтчэр адлюстраваны ў артыкуле А. Фоле «Вялікабрытанія і нямецкае адзінства» [55], манаграфіі Н. Гімлера «Паміж сілай і пасрэднасцю. Брытанская знешняя палітыка і заканчэнне халоднай вайны» [22], К. Кайзера «Нямецкае аб'яднанне» [32]. Розныя падыходы М. Тэтчэр і старшыні Форын офіс Д. Хэрда да германскай праблемы ў 1990 г. знайшлі адлюстраванне ў працы Г. Дзівальда «Германія – адзіная Радзіма»[15], вышэйназванай рабоце Н. Гімлера, калектыўным выданні «Нямецкая гісторыя з 1945 па 2000 г.» [11]. У мемуарах В. Момпера «Падзенне мяжы. Берлін у гарачай кропцы нямецкай гісторыі» [38] ахарактарызавана палітыка брытанскага боку ў Заходнім Берліне на працягу 1989–1990 гг. Скандальная «справа Рыдлі», звязаная з параўнаннем брытанскім міністрам Н. Рыдлі аб'яднанай Германіі з Чацвёртым рэйхам, а Г. Коля з А. Гітлерам, разгледжана ў працах Г. Кнопа «Нямецкае адзінства: мара і рэальнасць» [34] і Р. Фрыча-Барнацэля «Еўропа і германскае адзінства» [19].

Такім чынам, англа-амерыканская і нямецкая гістарыяграфія, якая адносіцца да германскай палітыкі Вялікабрытаніі ў 1980-я гг., не мае цэласных даследаванняў па дадзенай праблеме. Працы асобных аўтараў прысвечаны аналізу агульных кірункаў знешняй палітыкі Вялікабрытаніі і ФРГ, гісторыі германскага пытання ў цэлым, вывучэнню асобных аспектаў англа-заходнегерманскага ўзаемадзеяння, пераважна ў эканамічнай, знешнегандлёвай і ваенна-тэхнічнай сферах.

*Літаратура і крыніцы*

1. Aspects of the German question / hrsg. Vom Sozialwiss. Forschungsinst. d. Konrad-Adenauer-Stiftung, Sankt Augustin.

Рэпазіторый БДУ

Peter R. Weilemann (ed.). With contributions by Michael Sturmer… – 2. Aufl. – Sankt Augustin: Richarz, 1987
2. Aspekte der deutschen Frage / Hsgb. von K. Lange. – Herford: Busse Seewald, 1986. – 332 S.
3. Bewegung in der deutschen Frage? Die auslaendische Besorgnisse ueber die Entwichlung in den beiden deutscen Staaten / E. Schultz, P. Danylow. – Bonn: EU Verlag, 1985. – 224 S.
4. *Bickerich, W.* Helmut Kohl. Kanzler der Einheit / W. Bickerich. – Duesseldorf: ECON, 1995. – 272 S.
5. *Birke, A.* Grossbritannien und die deutsche Einheit / A. Birke. – Coburg: Prinz-Albert-Gesellschaft, 1991. – 19 S.
6. Britain and Germany in the XX century / Ed. by M. Goertemaker. – Oxford, NY, 2006. – 226 p.
7. British foreign policy: Tradition, change and transformation / Ed. by M. Smith. – London: Unwin Hyman, 1988. – 287 p.
8. British foreign policy under Thatcher / Ed. by P. Byrd. – NY: Phillip Allan, 1988. – 211 p.
9. *Davy, R.* Grossbritanien und die deutsche Frage // Das Ende der Teilung. Der Wandel in Dutschland und Osteuropa. Beitraege und Dokumente aus dem Eropa-Archiv. – Bonn: Internationale Politik, 1990. – 340 S. – S. 111–116.
10. DDR-Geschichte in Dokumenten. Beschlusse, Berichte, interne Materialen und Alltagszeugnisse / Hsgb. von M. Judt. – Bonn: Bundeszentrale fuer politische Bildung, 1998. – 638 S.
11. Deutsche Zeitgeschichte von 1945 bis 2000. – Berlin: Dietz, 2006. – 1359 S.
12. Deutschland-Grossbritannien-Europa: PolitischeTraditionen, Partnerschaft und Rivalitaet / Hsgb. von K. Rohe. – Bochum, 1992. – 388 S.
13. Die deutsche Frage als strategischer Schluessel / Hsgb. von Kiefer H.J. – Munchen: Olzog, 1988. – 83 S.
14. Die deutschen Kanzler von Bismarck bis Kohl / Hsgb. von W. von Sternburg. – Berlin: AufbauTaschenbuch, 1998. – 488 S.
15. *Diwald, H.* Deutschland einigVaterland / H. Diwald. – Wuerzburg: Books on demand, 2006. – 388 S.
16. Dokumente zur Deutschlandpolitik. Deutsche Einheit (Sonderedition aus den Akten des Bundeskanzleramtes 1989/90). – Munchen, R. Oldenbourg Verlag, 1998. – 1667 S.
17. *Duisberg, C.J.* Das deutsche Jahr / C.J. Duisberg. – Berlin: Wjs, 2005. – 392 S.
18. *Evans, E.J.* Thatcher and Thatcherism / E.J. Evans. – London: Routledge, 1997. – 147 p.
19. *Fritsch-Bournazel, R.* Europa und die deutsche Einheit / R. Fritsch-Bournazel. – Stuttgart: Aktuell, 1991. – 357 S.
20. *Hanrieder, W.F.* Germany, America, Europe: forty years of German foreign policy / W.F. Hanrieder. – London: New Heaven, 1989. – 509 p.
21. *Hanrieder, W.F.* The foreign policies of West Germany, France and Britain / W.F. Hanrieder. – New Jersey: Prentice-hall, 1980. – 314 p.
22. *Himmler, N.* Zwichen Macht und Mittelmass: Grossbritanniens Aussenpolitik und das Ende des KaltenKrieges / N. Himmler. – Berlin: Duncker und Humblot, 2001. – 296 S.
23. *Holmes, M.* Thatcherism: Scope and limits / M. Holmes. 1983 – 1987. – London, 1989. – 182 p.
24. *Garton Ash, T.* In Europe's name: Germany and the divided continent / Timothy Garton Ash. – NY, Random House, 1993. – 680 p.
25. *Genscher, H.-D.* Die Chance der Deutsche (Hans-Dietrich Genscher im Gesprach mit Guido Knopp) / H.-D. Genscher. – Munchen, Piper Verlag, 2008. – 199 S.
26. *Genscher, H.-D.* Deutsche Aussenpolitik. Ausgewaelte Reden und Aufsaetze. 1974-1985 / H.-D. Genscher. – Stuttgart, Bonn: Aktuell, 1985. – 588 S.
27. *Genscher, H.-D.* Erinnerungen / H.-D. Genscher. – Berlin: Siedler, 1995. – 1088 S.
28. Germany and Europe in transition / Ed. by A. Rotfeld, W. Stuetze. – NY: Oxford Uni Press, 1991. – 237 p.
29. Geschichte der Deutschen. 1949–1990. / E. Fuhr. – Frankfurt-am-Mein: Insel, 1990. – 287 S.
30. Grossbritannien und Deutschland. Nachbarn in Europa. – Bonn: Bundeszentrale fuer politische Bildung, 1988. – 182 S.
31. *Johnson, D.* Abschied von der Insel?:Grossbritannien im Wandel / D. Johnson. – Bonn: Dietz Nachf, 1997. – 212 S.
32. *Kaiser, K.* Deutschlands Vereinigung. Die international Aspekte / K. Kaiser. – Bonn: Gustv Luebbe, 1991. – 384 S.
33. *Kaiser, K.* British-German defense cooperation: Partners within the alliance / K. Kaiser, J. Roper. – London: New Heaven, 1988. – 45 p.
34. *Knopp, G.* Die deutsche Einheit: Traum und Wirklichkeit / G. Knopp, E. Kuhn. – Frankfurt-am-Mein, Berlin: Ullstein, 1991. – 304 S.
35. *Kohl, H.* Die deutsche Einheit. Reden und Gespraeche / H. Kohl. – Bonn: Gustav Luebbe, 1992. – 320 S.
36. *Kohl, H.* Erinnerungen 1982 – 1990 / Helmut Kohl. – München, Droemer, 2005. – 1134 S.
37. *Krenz, E.* Gefangnis-Notitzen / Egon Krenz. – Berlin: Verlag Das Neue Berlin, 2009. – 238 S.
38. *Momper, W.* Grenzfall. Berlin im Brennpunkt deutscher Geschichte / W. Momper. – Munchen: Bertelsmann, 1991. – 443 S.
39. *Nicholls, A.* Always good neighbours – never good friends?: Anglo-German relations 1949 – 2001 / A. Nicholls. – London: Germany history institute, 2005. – 43 p.
40. *Nicholls, A.* Die deutsch-britischen Beziehungen: Ein hoffnungsloser Fall? / A. Nicholls. – Bonn: Zei, 1998. – 22 S.
41. Partners and rivals in Western Europe: Britain, France and Germany / Ed. by R. Morgan, C. Bray. – Gower: GPCL, 1986. – 275 p.
42. *Plato, A.* Die Vereinigung Deutschlands – ein weltpolitisches Machtspiel / Alexander von Plato. – Bonn, BPB, 2003. – 485 S.
43. *Poetsch, H.* Deutsche Geschichte von 1945 bis zur Gegenwart / H. Poetsch. – Munchen: Olzog, 2006. – 330 S.
44. *Potthoff, H.* Bonn und Ost-Berlin 1969–1982 / H. Potthoff. – Bonn: Dietz Nachf, 1997. – 787 S.
45. *Pryus, K.* H. Helmut Kohl. Die Biographie / K.H. Pryus. – Berlin: Edq, 1995. – 572 S.
46. *Roedder, A.* Deutschland einig Vaterland / A. Roedder. – Munchen: Olzog, 2009. – 490 S.
47. *Schuller, W.* Die Deutsche Revolution 1989 / Wolfgang Schuller. – Berlin, Verlag GmbH, 2009. – 381 S.
48. *Seiffert, W.* Das ganze Deutschland. Perspektiven der Wiedervereinigung / W. Seiffert. – Munchen, Zuerich: Piper, 1986. – 377 S.
49. Thatcherism: personality and politics / Ed. by K. Minogue, M. Biddiss. – NY: St. Martin's Press, 1987. – 144 p.
50. *Thatcher, M.* In defence of freedom / M. Thatcher. – NY: Prometheus Books, 1987. – 150 p.
51. *Thatcher, M.* The Downing street years / M. Thatcher. – New York, Harper Collins Publishers, 1993. – 914 p.
52. *Thatcher, M.* Statecraft: Strategies for changing world / M. Thatcher. – London: Harper Collins Publishers, 2002. – 503 p.
53. The Cambridge history of the cold war. V. III. Endings / Ed. by M. Leffler, O. Westad. – Cambridge Uni Press, NY, 2010. – 694 p.
54. The two German states and the European security / Ed. by F. S. Larrabee. – NY: St. Martin's Press. – 1989. – 330 p.
55. *Volle, A.* Grossbritannien und die deutsche Einheit / A. Volle // Auf demSuchenach der Gestalt Europas. – Bonn: Internationale Politik, 1990. – 280 S. – S. 130–144
56. *Wolfrum, E.* Die Mauer. Geschichte einer Teilung / E. Wolfrum. – Muenhen: Olzog, 2009. – 192 S.
57. *Young, H.* One of us. A biography of M. Thatcher / H. Young. – London: Macmillan, 1989. – 570 p.

SUMMARY

*The article is devoted to the study of British, American and German historiography on the problem of British policy towards the German question in 1979–1990. The author researched the sources for the investigation in English and German and analyzed the main historical works of British, American and German scientists on the given problem.*

Пастуліў у рэдакцыю 20.07.2011 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ